парламентских выборах весной 1996 г. ГДП в очередной раз заняла первое место.

Далее, в начале XXI в., наблюдается удивительные изменения в предпочтениях избирателей. Например, состоявшиеся в апреле 2002 г. парламентские выборы в Венгрии принесли победу Венгерской социалистической партии. Выборы в польский Сейм, состоявшиеся в сентябре 2001 г., принесли победу социалистам.

Проведенный обзор позволяет сделать следующие выводы. Партийные системы постсоциалистических стран Восточной Европы, как и их политические системы в целом, представляют собой системы обществ переходного периода со свойственными чертами и особенностями.

Таким образом, в конце XX в. отмечается бурный рост количества политических партий в данных странах. Следует также отметить, что основная борьба за места в парламентах ведется между демократами и социалистами. На первых-вторых парламентских выборах наблюдался приход к власти демократических партий и их отступление на вторые позиции на последующих выборах, либо попеременная смена демократического и социалистического парламентского большинства государств Восточной Европы.

По нашему мнению, дальнейшее участие большого количества политических партий способствует укреплению демократии в обществе. В целом можно говорить о том, что в данных государствах успешно прошел процесс установления многопартийности, которая развивается с каждыми последующими выборами.

***Сянько А. В.***

## НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ЎРЭГУЛЯВАННЯ ПРАЦЭДУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭСПУБЛІКАНСКІХ СХОДАЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

*Сянько Аляксандр Віктаравіч, студэнт 2 курса Беларускага дзяржаўнага універсітэта, г. Мінск, Беларусь, gunmaster1983@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік: старшы выкладчык кафедры канстытуцыйнага права Арцем’еў Сяргей Юр’евіч*

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь не толькі рэальна замацоўвае інстытут дэмакратыі, але і стварае дзейсныя метады яе ажыццяўлення, адным з якіх з’яўляюцца рэспубліканскія і мясцовыя сходы. Гэты інстытут быў уведзены на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. у наступнай фармулёўцы: «У парадку, устаноўленым заканадаўствам, грамадзяне Рэспублікі Беларусь прымаюць удзел у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця на рэспубліканскіх і мясцовых сходах». Працэдура іх правядзення рэгулюецца Законам Рэспублікі Беларусь «Аб рэспубліканскіх і мясцовых сходах» (далей – Закон), указамі Прэзідэнта.

Што тычыцца рэспубліканскіх сходаў, назіраецца неадпаведнасць тэрміналогіі, бо паводле Закону Усебеларускія народныя сходы мусяць называцца рэспубліканскімі. Працэдура абрання ўдзельнікаў прадстаўляе асаблівы інтарэс. Па Законе «удзельнікі рэспубліканскага сходу абіраюцца на сходах калектываў працоўных арганізацый, грамадзян па месцы вучобы альбо службы, мясцовых сходах, сходах вышэйшых органаў рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб’яднанняў, палітычных партый, прафесійных саюзаў, рэлігійных арганізацый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія прадстаўляюць усе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі Рэспублікі Беларусь». Дадзеная працэдура амаль не адпавядае рэчаіснасці, таму што насамрэч удзельнікі абіраюцца на гарадскіх і раённых сходах упаўнаважаных. Больш дэтальна гэта адлюстравана, напрыклад, ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 03.05.2016 № 164 «Аб скліканні пятага Усебеларускага народнага сходу» (далей – Указ). Згодна з Указам «удзельнікі схода абіраюцца на раённых (гарадскіх) сходах упаўнаважаных»; «упаўнаважаныя на раённы (гарадскі) сход абіраюцца калектывамі працоўных арганізацый, ваеннаслужачых і працоўных воінскіх частак, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёна (горада), грамадзянамі па месцы жыхарства, грамадскімі аб’яднаннямі ў адпаведнасці з нормамі прадстаўніцтва, устаноўленымі раённымі (гарадскімі) арганізацыйнымі камітэтамі». Як можна заўважыць, спіс тых, хто можа абіраць упаўнаважаных паводле Указа, і спіс тых, кім могуць абірацца ўдзельнікі рэспубліканскага сходу паводле Закона, адрозніваюцца. Па Законе спіс больш падрабязны. Указ жа, з аднаго боку, спрашчае суб’ектны склад асоб, маючых права выбіраць, а з іншага боку – канкрэтызуе саму працэдуру, уводзячы двухступеньчатую працэдуру абрання ўдзельнікаў рэспубліканскага сходу.

Цікава, што нормы прадстаўніцтва тычацца менавіта тых, хто абірае ўдзельнікаў, а не саміх удзельнікаў. Гэта значыць, што ўпаўнаважаныя могуць абраць любога, хто адпавядае законным патрабаванням, якія прад’яўляюцца ўдзельнікам рэспубліканскага сходу, незалежна ад месца яго жыхарства.

Асобы, якія прысутнічаюць на рэспубліканскім сходзе паводле Закона падзяляюцца на 2 катэгорыі: удзельнікі і запрошаныя. Прынцыповая розніца ў тым, што ўдзельнікі маюць права голаса пры прыняцці сходам рашэнняў, а запрошаныя – не. Закон утрымлівае спіс асоб, якія ў абавязковым парадку запрашаюцца на рэспубліканскі сход: гэта Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Прэм’ер-Міністр, члены Урада, Старшыня Канстытуцыйнага Суда, Старшыня Вярхоўнага Суда і г. д. Уявім сітуацыю, калі асоба, запрошаная на рэспубліканскі сход, адначасова стала абранай сходам упаўнаважаных, і згодна з такім выбарам. Закон не ўтрымлівае нормаў, па якіх можна вызначыць, у якасці каго будзе выступаць такая асоба: як запрошаны ці як удзельнік? Аднак разумеем, што асоба сама вольная выбіраць свой прававы статус на рэспубліканскім сходзе.

Рэспубліканскія сходы склікаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па меры неабходнасці для абмеркавання важных пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця і праектаў адпаведных рашэнняў. Па традыцыі, «неабходнасць» узнікае кожныя 5 гадоў, таму што гэта прывязана да ўрадавай сістэмы дзяржаўнага планавання. Звычайна абмяркоўваюцца пытанні зацверджання праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступныя 5 гадоў.

Такім чынам, рэспубліканскія сходы – эфектыўная форма непасрэднага ўдзелу грамадзян у кіраванні дзяржаўнымі справамі. Але такі важны інстытут належыць больш дэтальна рэгламентаваць, у прыватнасці працэдурныя пытанні, правы і абавязкі ўдзельнікаў, іншых суб’ектаў, якія ўзгадваюцца заканадаўствам аб рэспубліканскіх і мясцовых сходах. Гэтая задача ўскладаецца на парламентарыяў шляхам унясення змен у Закон, альбо на Прэзідэнта шляхам выдання указаў.

***Ходосовский А. В.***

## ДЖЕРРИМЕНДЕРИНГ В СОЕДИНЕННЫХ ШТАТАХ АМЕРИКИ

*Ходосовский Антон Викторович, студент 3 курса Академии управления при Президенте Республики Беларусь, г. Минск, Беларусь,*
*hodosovskii-1998@mail.ru*

*Научный руководитель: канд. юрид. наук, доцент Сажина Варвара Владимировна*

6 ноября 2018 г. граждане США отправились на избирательные участки. На карту поставлено 435 мест Палаты представителей и 35 мест в Сенате в 33 штатах. Эти выборы принято называть промежуточными, поскольку они не включают в себя выборы Президента страны. Однако необходимо отметить, что промежуточные выборы все же отличаются серьезной борьбой за выборные места для обеих доминирующих партий США. С одной стороны, правящая партия (в данном случае республиканцы) пытается «удержаться на плаву» и получить новый кредит доверия от избирателей, что даст ей возможность далее последовательно проводить свою политику. С другой, оппозиционная партия (в данном случае демократы) получает колоссальную возможность увеличения своего представительства, концентрируя внимание электората на ошибках и провалах своих оппонентов. Результаты выборов последних десятилетий говорят о том, что промежуточные выборы для партии власти в подавляющем большинстве чаще всего заканчиваются в лучшем случае потерей мандатов без потери большинства, а в худшем – потерей большинства в палатах Конгресса и в легислатурах штатов.

Стоит отметить, что средства политической борьбы сегодня выходят за рамки традиционного представления. В последние годы активизировалась борьба с таким феноменом американской политической системы, как